Дзяржаўная ўстанова адукацыі

«Дварэцкая сярэдняя школа»

# Тэматычная інфармацыйная гадзіна

# “Беларусь мая сінявокая”

(віктарына)

у 2 класе

Падрыхтавала

Настаўніца пачатковых класаў

Гайдук С.Б.

2019 год

Дата правядзення: 9 снежня 2019 г.

Клас: II

Класны кіраўнік: Гайдук Святлана Бярнатаўна

Месца правядзення: кабінет II класа

Час правядзення: 08.30-09.15 гадзін

Тэма: «Беларусь мая сінявокая»

Форма: віктарына

Мэта: фарміраваць у вучняў станоўчы вобраз Рэспублікі Беларусь - самастойнай і незалежнай дзяржавы; спрыяць развіццю самастойнага мыслення; пашырыць кругагляд вучняў; стварыць умовы для фарміравання ў вучняў навыкаў камунікатыўнай культуры, павагі да Радзімы, выхавання пачуцця гонару і глыбокай павагі да нацыянальнай спадчыны, дзяржаўных сімвалаў краіны.

Абсталяванне: карта Рэспублікі Беларусь, дзяржаўная сімволіка, відэафільм з запісам Гімна РБ, тэлевізар, нажніцы, белыя лісты паперы, беларускі нацыянальны касцюм, вырабы з саломы і з ільну, выстава газет, алоўкі.

План правядзення

- Добры дзень, дзеці і паважаныя госці! Я вельмі рада бачыць вас такімі прыгожымі, здаровымі і вясёлымі. Вучняў я па праву магу назваць гаспадарамі, а вас, паважаныя прысутныя - гасцямі.

- Ва ўсіх народаў свету ёсць добрая традыцыя - пры сустрэчы з новымі людзьмі трэба абавязкова павітацца. А вітацца мы будзем не ззусім звычайна.

***<u>Гульня " Прывітанне"</u>***

Усе госці і дзеці становяцца ў круг.

- А ці ведаеце вы, як вітаюцца беларусы?

* За руку (усе па кругу вітаюцца)

- А як вітаюцца ў Нікарагуа?

* Плячамі ( усе вітаюцца плячамі)

- А як вітаюцца ў Зімбабве?

* Труцца спінамі( усе труцца спінамі)

- А як вітаюцца ў Італіі?

* Абдымаюцца (усе абдымаюцца)

- Вось мы і павіталіся. Здаецца, што мы знаёмы ўжо даўным даўно. А цяпер перайдзем да тэмы нашай інфармацыйнай гадзіны. Сёння ў нас пройдзе віктарына пад назвай “Беларусь мая сінявокая". Пачаць яе я хацела б такімі радкамі:

Радзіма наша - Бедарусь,
І колькі не шукай,
Не знойдзеш ты на ўсёй зямлі
Мілей, чым гэты край.

- Сёння мы з вамі пашырым свой кругагляд аб Радзіме, аб дзяржаўных сімвалах і традыцыях беларускага народа, зазірнем у мінулае і сучаснае нашага старадаўняга краю.

- Віктарына пройдзе ў некалькі этапаў. На дошку будуць па чарзе вывешвацца назвы ўсіх этапаў віктарыны.

***<u>1 этап - Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь</u>***

1. Што з'яўляецца галоўнымі дзяржаўнымі сімваламі РБ?
2. Што сабой уяўляе герб РБ?
3. Чаму ў вянок герба ўплецены канюшына і лён?
4. Што абазначае пяцікантовая зорка?
5. Скажыце, у якіх выпадках выконваецца гімн РБ?
6. Успомніце, якімі радкамі пачынаецца гімн РБ?

( дзеці глядзяць відэафільм з запісам гімна РБ і спяваюць)

1. Што абазначаюць тры колеры на Беларускім Дзяржаўным Сцягу?

2. Што азначае арнамент?

***<u>Фізкультхвілінка</u>***

***<u>2 этап - Грамадзянскія адносіны ў РБ і традыцыйная народная культура (прадметная нагляднасць)</u>***

1. Як называецца галоўны закон Рэспублікі Беларусь?
2. Як вы лічыце, чаму на нашай выставе вы бачыце менавіта гэтыя газеты?
3. Скажыце, а якія газеты і часопісы выпісвае ваша сям'я?
4. Што вы ведаеце аб традыцыйнай культуры беларускага народа?

Настаўнік дэманструе экспанаты:

- вырабы з саломы (кветкі, капялюш, скрыначка, хлебніца)

(Дзеці расказваюць паведамленне аб дэкаратыўна-прыкладной творчасці)

- беларускі нацыянальны касцюм;

(Дзеці расказваюць аб беларускай нацыянальнай вышыўцы)

- саматканыя ручнікі;

Настаўнік дэманструе мультымедыя - праект “Крылы ільняныя - ручнікі"

***<u>3 этап - Пажаданні сваёй краіне</u>***

Гучыць песня ў выкананні Анжалікі Агурбаш " Белая Русь"

Дзеці на лістах паперы адрысоўваюць сваю далонь, пішуць на ёй пажаданне сваёй краіне і памяшчаюць яе на карту РБ.

- Я не сумняваюся, што ўсе вашы пажаданні збудуцца, таму што галоўны лозунг нашай дзяржаўнай палітыкі “За моцную і квітнеючую Беларусь"- супадае з вашымі пажаданнямі.

***<u>4 этап – Рэфлексія</u>***

- Звярніце, калі ласка, увагу вось на гэтыя плакаты.

Падумайце кожны пра сябеі адкажыце на гэтае пытанне.

(Выказванні дзяцей і ўсіх прысутных)

- Вялікі дзякуй за вашы адказы, за вашу працу на ўроку. Я ўпэўнена, што вы вырасцеце сапраўднымі грамадзянамі сваёй краіны, працалюбівымі, сумленнымі і чулымі. І мы яшчэ прачытаем вашы імёны вось на такіх плакатах!